№ 24 Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты:

на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопіс

выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакціі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі:
М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:

на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 24 (220). Год III. Вільня, **22** марца 1918 г. Цэна **5** фэн. (**3** кап.

21 марца.

Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага: Між Діксмуйдэн і Лябассэ жывейшая разведачная работа. Крапчэў агонь артылерыі.

Фронт нямецкага Насьледніка: Артылерыйскі агонь узмацаваўся.

Фронт ф. Гальвіца: Артылерыйская бітва пад Вэрдэнам дайшла ў вечары вялізарнай сілы. **Пры Орн баварскіе роты неспадзеваным штурмам занялі першую варожую лінію** і ўзялі ў палон 240 французаў, у тым ліку 20 афіцэраў. Пры Айрэмон мы ўзялі 78 палонных.

Фронт Альбрэхта Вюртэмбэрскага: Агонь французскай артылерыі ў лесі Паруа трывае далей.

На шырокіх адрэзках заходняга фронту артылерыйская баталія пачалася сягоньня раніцай поўным ходам. Аўстрыяцкая артылерыя прыняла учасьце ў бітвах проці англічан і французаў.

Усход

Мы занялі Херсон.

БЭРЛІН. **Глаўная Камісія Рэйхстагу.** На пытаньне дэпутата Юнга (нацыонал-лібэрала) аб праўным палажэньні зямель на ўсходзі ад назначэнай лініі тайны райчы. Сімон адказаў, што яшчэ не пастаноўлено, што будзе з гэтымі можэ яшчэ ў «зачаткобым стане» абшарамі. Інтэрнацыональнае палажэньне іх жыхароў з гэтай прычыны так сама невыясьнено.

Барон ф. **Рэхэнбэрг** (клерыкал) заявіў: Эстляндзія і Ліфляндзія пасля вываду нашых войск павінны яшчэ ўмовіцца з расейскім урадам. На землях на заходзі ад устаноўленай лініі не адкладаючы павінен быць заведзен акуратны дзержаўны лад, нашы адміністрацыйные установы павінны быць выдалены і на іх мейсцо утворэно запраўднае народнае прэдстаўніцтво.

Дэпутат **Давід** (соцыаліст) сказаў: Паводлуг мірнай умовы Эстляндзія і Ліфляндзія прыналежаць яшчэ да Расеі. Калі гэтые землі законным спосабам аддзеляцца ад Расеі і прылучацца да нас, дык мы нічога проці гэтага не маемо. Без прызнаньня незалежнасьці Літвы мы ня можэм скончыць пытаньня аб мірнай умове.

Начальнік упраўленьня Курляндзіі **ф. Госслер,** заявіў: Граніцы, паказаные ў мірнай умове, на практыцэ немагчымы. Курляндзія ў цяперашніх межах ня можэ быць здольнай да жыцьця. Яшчэ менш ясна, што павінно быць з Рыгай. Народам за устаноўленай лініей павінна быць дадзена магчымасць самым пастанавіць, што з імі будзе,—бо яны ўжо аддзелены ад Расеі. С пагляду латышоў устаноўленая лінія — немагчымая, бо латышы ня хочуць быць раздзеленымі. Паўнамочча цяперашняга краёвага прэдстаўніцтва законны і с палітычнага гістарычнага пагляду не вызыва-юць сумлеваньня. З 80 членаў краёвай рады 30 — не немцы. У ей прэдстаўлены такжэ сельскіе работнікі. Мястовые работнікі, праўда, не прэдстаўлены, але с прычыны свайго рэволюцыонізму яны і ня могуць быць дапушчены да дзержаўнай будоўлі. Мы ня можэмо дапусьціць у межах Нямеччыны незалежную латышскую рэспубліку. Гутарка можэ ісьці тольки аб гэрцогстве, або пэрсональнай уніі. Упраўленьне краю прыхілілося да пэрсональнай уніі. Латышы хочуць мець шырокую і сільную гасударственую ўласць, каторая магла бы гадзіць антагонізмы. Варункі ў Літве блізка гэткіе самые.

Эрцбэргер (клерыкал): Пытаньне аб адносінах Ліфляндзіі і Эстляндзіі да Расеі мае становучую вагу для ўсяе мірнай умовы. Гэтае пытаньне павінно быць развязано за ўселякую цану. Устаноўленая лінія немагчыма. Чым кіраваліся, намечаючы яе? Пэрсональная унія звязана з вялікімі труднасьцямі.

Начальнік імперскай канцэлярыі, ф. **Радовіц,** заявіў, што заява Эрцбэргера, бытцым прускае міністэрство пратэставало проці устанаўленьня для Нямеччыны лініі Нарэва, неправільна.

БЭРЛІН 21.III. Учора прыбыла расейская дэпутацыя дзеля аддачы зацьверджэнай мірнай умовы. Сягоньня сюды прыежджае будучый прэдстаўнік Украіны ў Нямеччыне.

ПЭКІН. Японія змобілізавала 19 дывізій.

БЭРЛІН (Рэўтэр). Саюзьнікі зрабілі вялізарные прыгатаўленьня дзеля аканчацельнай баталіі на Заходзі.

ВЕНА. Дунай да Суліны ачышчэн ад мін і дарога ў Украіну вадой адкрыта.

ПЕЦЯРБУРГ. С Кітаем зроблена умова аб пагранічных справах.

Адозва.

Пад той час, як на ўсходзі ўзыйшла зараніца міра, засьляпіўшыеся ворагі на заходзі яшчэ ня хочуць выцягнуць рукі дзеля згоды. Яны ўсё яшчэ спадзяюцца, што ім удасцца сілай аружжа разбіць Нямеччыну. Яны павінны будуць перэканацца, што нямецкі меч захаваў сваю старую вострасць, што адважнае нямецкае войска, ня знаючае адпору ў наступленьні, нязломнае ў абароне, ніколі ня можэ быць звоёвано. Ізноў клічэ Нямеччына і трэбуе срэдства дзеля захаваньня на даўнейшай гордай вышыні пабедную сілу свaей арміі. Калі памогуць усе — гарады і вёскі, багатые і бедные, высокіе і нізкіе,—тады і восьмая ваенная пазыка акажэцца дастойнай ранейшых фінансовых пабед. Тады і яна будзе праўдзівай нямецкай народнай пазыкай.

Вільня, 22 марца 1918.

Мір між Нямеччынай і Расеей аканчацельна зацьверджэн. У апошні момэнт перад выпускам папярэдняга нумэру мы атрымалі дзьве тэлеграмы, каторые ў ім і надрукавалі. Адна апавешчала, што «саюзная рада гасударств Нямеччыны высказала сваю згоду на мірную умову з Расеей»; другая—што «16 марца ўсерасейскі конгрэсс ў Маскве пацьвярдзіў мірную умову між Расеей і цэнтральнымі дзержавамі, падпісаную 2-го марца у Брэст-Літоўску».

Гэтак формальна развязано пытаньне аб далейшых адносінах між дзержавамі на Усходзі. Але, ня гледзячы на формальную развязку, пытаньне гэтае ўсё яшчэ стаіць перад тымі кругамі расейскага грамадзянства—расейскай буржуазіей, каторая ўвесь час не перэставала клікаць народ да далейшай вайны—«вайны да пабеднага канца». Мы гаворым тутака аб даволі сільнай партыі кадэтаў, каторая цяпер на грунці нездавольства мірам здалела прыцягнуць да сябе партыю соцыялістаў-рэволюцыонераў, і гэты саюз працуе дзеля разбіцьця большэвіцкага ураду і ўсяе яго мірнай работы.

І ад таго, як уложацца ўнутрэные справы ў Расеі, залежыць пытаньне, чы формальны мір будзе запраўдным, моцным і трывалым мірам.

«Berliner Tageblatt» у № 142 з 18 марца (вячорнае выданьне) піша аб просьбе аб помачы, с каторай менскае беларускае прэдстаўніцтво звярнулося да Нямеччыны ў дэклярацыі, надрукованай у апошнім нумэры «Гомана»:

«Імперскі урад стаіць на тым становішчы, што гэткая помач немагчыма, бо пры падпісаньні міра у Брэст Літоўску ён цьвёрда абязаўся не паддзержываць ніякіх сэпаратных тэндэнцый у новых вялікарасейскіх граніцах».

Вербная нядзеля.

І многіе разсьцілалі на дарозі опраткі свае, а іншые зрэзалі галіны дзярэў і пасьцілалі на дарозі (Ад Марка, XI, 8).

У нас не растуць ні пальмы, ні багатые хараством кветкі палудня; сонцэ шмат дзён у гаду ледзьледзь выгляне з за хмар; у гадаўшчыну трыумфальнага ўезду ў Еразоліму Збаўцы сьвета у нас лёд яшчэ пакрывае схаваўшыеся ў лясным гушчары вазёры ды балоты,—дзе-недзе тыкеля выглядывае нясьмела першая прад-вясеньняя кветка — сіненькая пралеска ды пахіліўшыеся над берагам рэчкі убогіе вербы працягіваюць да сонца сваі пакрыўшыеся «коцікамі» галіны... Сівер яшчэ ад часу да часу гуляе між прабудзіўшыміся са сну дрэвамі і напамінае, што не зусім яшчэ мінула зімовая нядоля...

Ня кветкі, не пальмовые галіны зрывае ў гэты дзень рука беларуса: ён ламае маладые галінкі убогай вербы сваей, каб спаткаць, чым багат, прыход Таго, Хто нёс людзём радасную весць аб царстве Божым на зямлі...

І заве беларус нядзелю гэту *вербнай...*

Рука вясковай дзяўчыны прыбірае голую галіну шэрым мохам, фарбаванымі стружкамі, сухім зельлем... Рукі мешчанкі майструюць с колеровай паперы кветкі...

Сьвятыня шчыльна напоўнена народам. Чуваць шурх пэркаліковых накрахмаленых спадніц, паперовых кветак... Праз вітражовые вокны сыплюцца на пахіленые галовы рознаколерные праменьні сон-

ца... Пад шэрымі сермягамі мацней б'юцца сэрцы, бо —

за тыдзень
Вялікдзень...

Вялікі гэта быў Дзень, калі вось без мала праз два тысячалецьця ў цяжкую хвіліну свайго жыцьця людзі клічуць на помач імя Пайшоўшага за усіх на крыжовые мукі... Гэта быў Вялікі дзень, калі споўнілася запаведзь Таго, чыі збялеўшые вусты шэпталі: «Божэ! даруй ім, бо ня ведаюць, што робяць...» — Таго, хто ізноў паявіўся між сваімі здзіўленымі вучнямі, жыўшымі дагэтуль трагічнымі успамінкамі Гольготы...

. . . .

У паветры пах вясны... Людзі разыходзяцца, памаліўшыся Богу... Настраеньне сьвяточнае, вясёлае... Паводлуг старога звычаю недзе адзін аднаго сьцёбае вербай с прыказкай:

Не я б'ю,—
Верба б'е!—
За тыдзень
Вялікдзень,
За шэсць ноч
Вельканоч...

Ф. О.

† Ігнат Буйніцкі.

(Пасьмертны успамін).

Справа адраджэньня жывога народу, справа будаваньня ўсяго таго, што патрэбно дзеля культурнага жыцьця яго,—гэта вялізарны, цяжкі труд, каторы можэ быць споўнен толькі напружэньнем усіх творчых сіл народу. Трэба будаваць асновы экономічные, закладаць фундамэнты дзеля сваей навукі, літэратуры, краснага штукарства. Трэба здабыць тое, чым жыве душа і цела. І ў гэткай агульнай, усенароднай рабоці цэнна праца кожнага чэлавека, хоць бы ён выбраў сабе найменшую частку яе: бо без малога і вялікага не збудуеш.

Да такіх праяў нацыональнай працы, каторые не даюць матэр'яльнай карысьці, але без каторых увесь нацыональны гмах будзе аднабокі і незакончэны, належыць праца нашых артыстаў — ці то артыстаў слова, ці песьняроў і сьпевакаў, працаўнікоў сцэны, мастакоў малярства і інш. Бо ўсе яны творань тое, што дае выражэньне душы народу. А найбольш яркае і безпасрэднае выражэньне нацыональнае душы—гэта песьні народные, гэта праявы народнага мастацтва, каторае выяўляецца—побач с песьняй —такжэ і ў танцу.

Многа паэтаў даў ужо малады беларускі рух, а між імі цэлы сьцяг імён, каторые заўсёды будуць занімаць пачэснае мейсцо ў нашай літэратуры. Многа працаўнікоў бачым мы і на сцэне беларускага тэатру, многа зроблено дзеля адраджэньня песьні—хораў. Але ня менш яркую праяву становяць беларускіе народные танцы, каторые выведзены на эстраду у артыстычнай абработцы. І ў гэтым—заслуга чэлавека, каторы першы паставіў танцы беларускіе на артыстычную вышыню. Імя яго —Ігнат Буйніцкі, той, а каторым пісаў Янка Купала:

Важна рэй Ігнат Буйніцкі
  Ў танцах нашых водзіць,
Аж, здаецца, усё чыста
  Хадыром з ім ходзіць.
Калі пусьціцца скакаці,—
  Ажно сэрцэ скачэ!
Лепшых танцаў і ўвесь Піцер
  Бадай што не бачыў.
Ці Мяцеліца, ці Юрка,
  Мельнік, ці Антошка,—
Ўсё ў яго выходзе гладка,
  Ня вмыліць ні трошка.
Пад дуду і пад цымбалы
  Топне — прыспевае...
Сьцеражыцеся ўсе людзі:
  Беларус гуляе!
Не ўнімайся-ж і скачы нам,
  Покі сілы хваце,
Мо пачнуць і думкі нашы
  Весялей скакаці!

(„Шляхам жыцьця“ 1913 г.).

Здаецца, так нідаўна ўсё гэта было, і ня хочэцца верыць, што ўжо ніколі не ўбачым мы гэтага неўтамімага танцора-артыста. Ня хочэцца верыць, што перэстало біцца гэтае гарачае сэрцэ шчырага сына Маці-Беларусі. З глыбокім жалем прачыталі мы вестку „Вольнай Беларусі“ аб сьмерці Яго — ў лістападзі леташняга году.

Сьв. п. Ігнат Буйніцкі будзе доўга жыць у памяці тых, каму даводзілося бачыць яго на сцэне. Але гэтым не агранічывалася Яго праца дзеля беларускай справы: разумеючы вагу народнага тэатру ў роднай мове, Ігнат Буйніцкі арганізаваў драматычную дружыну, с каторай і пусьціўся у аб'езд Беларусі. Шмат мястэчэк і вёсак першы раз бачылі у сябе гэткіх рэдкіх гасьцей і горача іх віталі, захоўваючы ў сэрцах сваіх яркіе успаміны бачэнага. А гдзе праехала дружына Буйніцкага, там засеваліся зерняты нацыональнай сьвядомасьці і даволі багатые плёны.

Не абмежываючыся тым, што патрэбно для душы, рупіўся Ігнат Буйніцкі і аб тое, што трэба яго народу для цела. У сваім родным куце Ён многа напрацаваў дзеля падняцьця дабрабыту беларускіх селян, організаваў у Празароках (Дзісьненскага п.) Беларускі Хаўрусны Банчок, коопэратыўную краму і на грунце экономічнай работы будзіў, як мог і умеў—жывым словам, вершамі, песьняй, кніжкай і газэтай любоў да ўсяго беларускага, да роднай Зямлі.

Ніхай жэ лёгкай будзе Яму ўмілаваная родная Зямліца, ў каторай перадчасна супачыў!

А. Л.

„Великороссъ“.

Пачаўся вялікарускі нацыональны рух. У Маскве выходзіць газэта вялікарускіх адраджэнцаў „Великороссъ“.

У часі „переоцѣнки цѣнностей“ усе нацыі Расеі пачалі самаазначацца. Нарэшце, хоць спозьнено, прыступілі да гэтага і вялікарусы.

«Великороссъ» тлумачыць сваё спозьненнае выступленьне гэтак:

„Былоб дзіўна, каліб у першые мінуты разрухі вялікарускі народ, — зьбірацель гасударства, тварыцель еднасьці—першы шкодзіў бы гэтай еднасьці, пачынаючы самаазначацца і думаць аб сабе, пазваляючы акружаючым яго народам, як братэрскім маларусам і беларусам, таксама і другім, рабіць, як яны знаюць“.

Газэта „Великороссъ“ падае цэлы цыкль гарачых адозваў-поклічаў да вялікарускага народу. У гэных адозвах самабічаваньне, раскаяньне ў вялікіх грахох, у свaей цемнаце:

„Народ наш страціў сябе“ у сумную гадзіну гора. І як чэлавек, „каторы сябе страціў“, яму трэба зьбірацца ў гурток, апамятацца, падвесьці самім сабе ўва ўсім падрахунак, зразумець, хто ён, што яго акружае і што чакае“.

«Дагэтуль яшчэ шмат рускіх людзей, жыхароў цэнтра, ня ведаюць нават, што яны «Вялікарусы». А глаўнае — селяне называюць сябе або проста „рускімі“, або «праваслаўнымі».

І вось яны знайшлі сваю маці:

«Яна — Вялікаросія».

«Великороссъ» у цэлым сьцягу артыкулаў тлумачыць духоўную самабытнасць і псыхіку вялікаруса, каторы шмат розьніцца ад украінцаў і беларусаў». Так сама газэта азначае этнаграфічную граніцу Вялікаросіі.

Гэта ўсё добра, і ўсе суседніе народы гатовы сымпатызаваць і спагадаць новаму руху, калі ён пойдзе простым натуральным шляхам. Толькі ёсць тут адзін дысонанс—«апека» над малодшымі братамі сваімі. Жаданьне захаваць сваё першынство — так тарчыць, як шыла ў мяшку. І сьмешна робіцца, калі «Великороссъ», пасьля вялікага стагнаньня аб нацыональным упадку, дзе ён радзіць павучыцца ў украінцаў, Дону і др. кажэ:

«А памятайце і ведайце, што для нас адзін толькі шлях — самым будаваць Вялікаросію, а з ёй і праз яе — Расію!»

І яшчэ у шмат другіх мяйсцох газэты прабіваецца тэндэнцыйнасць «апекі».

Не, «Великороссъ», апякуйся ляпей над сабою, а беларусы і украінцы здалеюць і самі с сабой управіцца...

(З «Вольнае Беларусі»).

ПАГОНЯ. *)

Пасьмертны верш М. Богдановіча.

Як толькі у сэрцы трывожным пачую
За краіну родзімую жах,
Успомню Вострую Браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях.

*) Гэрб Беларуска-Літоўскай дзяржавы — **Вялікага Князьства Літоўскага.**

Максім Гарэцкі.

АНТОН.

(Абразы жыцьця).

(Гл. «Гоман» № 23).

IX.

Абы б беда, а шыя будзіць
Прыказка.

У простага сына натуры пануіць толькі адна кароткая філазофія: „Гэтак трэба...“
З. Бядуля.

Марна над крожвай ржавее каса.
Я. Купала.

Да вечара:

ДОМНА. (прышоўшы с цэрквы і выстаўляючы гаршкі) Антон, што ты гэткі белы і быццым плакаць рыхтуішся ці мне так здаецца...

АНТОН. Табе здаецца... так я.

АУТУХ. Ну, лезь за стол будзем палуднаваць, ты ж і са мною нічога ня еў...

АНТОН. Не хачу есьці... (бярэць шапку).

ДОМНА. Што з гэтым чэлавекам? Куды ж ты?

АНТОН. Пайду... каня глядзець у лесі.

АУТУХ. Што ты гаварыць ня хочыш з намі?

АНТОН. А? (пайшоў за дзьверы).

ХОДАЧКА і ЙВАНЬКА. Чаго татка пашоў?

АУТУХ. Спытайся, калі патрапіш, у свайго таткі, куды ён пайшоў...

ДОМНА. Во чэлавек, чэлавек...

(Усі паціху ядуць кулеш і потым, пераксціўшыся, расходзяцца хто куды).

Позна вечарам:

ДОМНА. Сьпіце, сьпіце, мае дзеткі, ато дзед сварыцца будзе, што не даецё заснуць яму, ён заўтра раненька на аблаву пойдзіць.

ІВАНЬКА. У Цёмны Лес?

ДОМНА. У Цёмны Лес, толькі сьпі...

ХОДА. Мамка, лямку загасіла, а таткі німа і не вячэрыў..

ДОМНА. Сьпі, ён к некаму зайшоў.

ХОДА. Не-а, татка прыдзіць.

НЕХТА. (шамаіць на вуліцы каля сьценкі, потым у вакно) Ляп! ляп! ляп!

ДОМНА. Ці ты, Антон?

НЕХТА. (глуха з-за вакна) Я... адчыні...

ДОМНА. Ляжыце, ня бойціся... (пайшла на двор; гамоніць там з Антонам).

ДОМНА. (уходзіць) Гзе ж гэта цябе насіла Божа помач у такую пару. Каб у сьвята аддыхнуць, бадзяешся нівесь гдзе... і цалюткі дзень (чыркаіць сернікамі).

АНТОН. Аддыхну... (садзіцца на лаўку, мокры, змучэны, вочы ўваліліся).

ДОМНА. (ставіць яму на стол міскі с крупеняю і варывом) Еж ды лажыся, атпачывай... (палезла на пол).

АНТОН. (маўчыць; паменьшыў агонь у лямпі і разуваіцца. потым памыў рукі, сеў за стол, пачарэпаў ложкі дзьве варыва і сядзіць) Домна!

ДОМНА. (паўсонна) Што?

АНТОН. Бацька сьпіць?

ДОМНА. Сьпіць у сенцах, і ты сьпі...

АНТОН. А-га... (тушыць агонь і моліцца Богу).

Ноччу:

АУТУХ. (паўзець у хату і мацаіць на лаўцы) Згыркалі карэц... і гдзе яны яго хаваюць... Не набгом жэ піць мне з вадзянкі... [illegible]? Хто ля вокна?

АНТОН. (ціха) Я...

АУТУХ. Ці ты позна прышоў? Чагож ты сядзіш, кладзіся спаць...

АНТОН. У вакно гляджу... дождж ідзець...

АУТУХ. Ужо зараіць, чаму ня сьпіш, кажу? (стукаіць карцом) Во куды заперлі, на суднік, знайдзі у поцемку... Лажыся, Антон... Што ты вытвараеш?..

АНТОН. (маўчыць) Ы-кы... (уздыхнуў).

АУТУХ, Не сядзі... (пайшоў у сенцы).

АНТОН. (пасядзеў яшчэ) Ой, ой, ой... (мімаволі паойкаў і пашоў на двор).

ДОМНА. (прашнулася) Іванька, Іванька, Ходачка! Ходка! Можэ вонкі хочэце? Ўстаньце...

ХОДА. Ы-мы-мы... Я не хачу...

ДОМНА. Ну хадзі ты Йванька! (пайшлі цупаючы у цямноці).

АНТОН. (на спатканьня). Гэта я, ідзіце йдзіце...

ДОМНА. Чаго ты ўсё ходзіш? Я ня ведаю, ці лажыўся ты?

АНТОН. Лажыўся, спаў... (кладзецца на лаўцы, але ізноў, калі жонка с сынам прышлі і пазаснулі, ўстаў і ходзіць па хаці, а то ў пуню пойдзіць, то с сабакам на дварэ пагамоніць, то сядзіць за стол і ўзіраіцца праз вакно у цемень; дождж перэстаў, толькі са стрэх капліць і і цурбоніць у цэбр ля ганак.

Ціха ў хаці; Домна часам варушыцца і моніць карову праз сон, дзеткі цяжка дыхаюць і стогнуць.

(Далей будзе).

У белай пені праносяцца коні,—
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць.
Старадаўнай Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць!
У бязьмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады...
Вы за кім у пагоню сьпяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?
Мо' яны, Беларусь, панясьліся
За тваімі дзяцьмі у здагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?
Бійце ў сэрцы іх — бійце мечамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрцэ начамі
Аб радзімай старонцы баліць...
Маці родная, Маці — Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына
За Цябе яму ўмерці дазволь!
Усё лятуць і лятуць тые коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўнай Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць...

(«Вольная Беларусь» № 32).

Беларускі марш.*)

(перадрукавана з «Беларускае Рады»).

Вецяр сядравы пранёсься над борам
Смагаю жыцьця абвеяў лісты,
«Слухайце уважна людзі пакоры!
Йдзе вызваленьне, ўставайма, браты!»

Разам, наперад, шлях працярэбім
Простым людзём да людзкога жыцьця
І Беларусь-Маці долю угледзе
Устане, як Лазар, з руін, з забыцьця.

Сьціха пачалі шаптацца вяршыны,
Іхню гаворку пачуў увесь лес
І загрымелі мільёны галінаў:
„Годзі ўжо зьдеку, Народ уваскрэс!"
Разам наперад...

З захаду, ўсходу на нашые шыі
Селі б'ючыся два хціўых крукі,
Каб змацавацца, нашу кроў пілі,
Гэтак заснуў наш народ на вякі.
Разам наперад...

Сон горэй сьмерці! Рвуць цела жывое,
Дзелюць на часткі суседзі — зьвяры.
Вырвалі сьмехам і сэрца з душою,
Суд разсудзілі: памёр без пары.
Разам наперад...

Толькі ж ня знішчыць дух наш народны!
Вецяр на крыльля яго патхапіў,
Стаў ён з'яўляцца тады сыном родным
Сон іх будзіць, каб уставалі, ішлі
Разам наперад...

Тры ясных зоркі у цёмную поначу
У будучыну нам сьцежку ясьняць
Завуцца ж: воля, брацтва і роўнасць, —
Будзем крывёй іх сваёй здабываць.
Разам наперад...

Тых, што пагінулі ў бойцэ за праўду,
Тых што вякуюць у вастротах гнілых,
Усіх памятайма пакуль дамо рады,
Звольнім старонку, памсьцімся за ўсіх.
Разам наперад...

У Вільні і ваколіцах.

× **„Бутрым Няміра"** (**Каменная труна**), усцэнізованая легенда у 2 актах Ф. Олехновіча, друкаваная ў „Гомане", выйшла з друку ў асобнай адбітцы. Цэна 50 фэн.

*) Пяецца на матыў рускае рэвалюцыйнае песьні „Вихры враждебные вѣютъ надъ нами".

Кніжка прадаецца ў рэдакціі „Гомана", Віленская вул. 33, 1 (адчынена ад 11 да 1 гадз. раніцы).

× **Літоўскі паэт Відунас** 22 марца скончыў 50 гадоў.

× **Цэны на электрычную энэргію** ад 1 красавіка 1918 г, павышаюцца. За кілоўат-гадзіну будуць браць:
а) за асьвятленьне — — 1 м. 30 ф.
б) за сілу — — — — — 65 ф.
Шчотчыкі будуць даваццa за аплату па 1 м. ў месяц.

За асьвятленьне ваконных выстаў, крам і т. п. цэна будзе паменшана так сама да 1 м. 30 ф. за кілоўат-гадзіну — замест цяперашніх 2 м.

× **Пажары**. У першай палове цякучага месяца было вельмі мала пажароў: ўсяго толькі 3, ды і то невялікіе.

14.III. а 5 г. 30 м. вечара на В. Пагулянцы № 3 (д. Бунімовіча) ўаднэй кватэры загарэўся сянік на ложку: мусіць кінулі агонь у лежаўшые пад ложкам паперы. Праз 20 мін. пажарнікі загасілі агонь.

15.III. а 10 г. 30 м. раніцы на Палтаўскай вуліцы на таварнай станціі ад сільна нагрэўшайся печы загарэліся дровы, зложэные за печкай. Праз поў гадз. пажар быў спынен Навагрудзкім аддзелам пажарніцкай старожы.

15.III. а г. поў 2 на І Бэрнардынскай вул. № 8. (д. Завадзкага) пачаўся пажар на люхце. Агонь, здаецца, быў па неасьцярожнасьці закінут між салому і інш. сьмеці. Пажар загасілі праз поў гадз. Згарэла часць люхту.

× **На вуліцы.** Прачка, Міхаліна Езэфовічовая, несла на Паплаўскай вул. кош з бялізнай ды, пасьлізнушыся на вузкім тротуары, ўпала і зламала сабе правую нагу. У карэтцэ скорай помачы адвезьлі яе ў бальніцу Савіч.

× **На саначках.** Гэлена Мечкоўская везла з Новага Сьвету на саначках бульбу. Спускаючыся з гары, яна села на саначкі з бульбай і, шыбка ехаўшы ў ніз, ударылася аб тэлеграфны стоўб і зламала сабе правую нагу. Скорая помач адвезла яе ў бальніцу ў местовай салі.

× **Нешчасьлівые здарэньня.** Пасьлізнуўшыся на вуліцы, ўпаў і зламаў сабе ногу нейкі Уладыслаў Давідовіч, 75 г. Карэтка скорай помачы адвезла яго ў бальніцу ў местовай салі.

Такі жэ самы прыпадак здарыўся і са Сцепанам Станкевічам, 35 г. Скорая помач адвезла яго у бальніцу Савіч.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
18—19	+ 1,8°	— 4,8°
19—20	+ 5,5°	— 2,2°
20—21	+ 5,5°	— 3,6°

БІБЛІОГРАФІЯ.

Касьцельныя песьні. Сабраў Вінцэнты Гожэльнярскі. Петраград 1917. Стр. 30. Коштам выдавецкага таварыства „Л. Хвецько і Спка" ў Петраградзе пад канец леташняга году паказалася кніжка беларускіх касьцельных песьняў. Кніжка выходзіць з рук адпаведных і компэтэнтных: выдаўцом ёсць кс. Хвецько, адзін с пёнераў беларускага руху ў архідыэцэзіі Магілеўскай і выдавец „Крыжа", а сабраў песьні і ноты даў Вінцэнты Гожэльнярскі, дырыгент катэдральнага хору ў Пецярбурзе і вучыцель сьпеву ў Пецярбурскай духоўнай акадэміі і сэмінарыі. Пазваленьне на друкаваньня гэнае кніжачкі, як раней на іншые рэлігійные выданьні, даў ксёндз біскуп-суфраган Цепляк, каторы хоць с Польшчы, але разумее патрэбы беларусаў — каталікоў. Хіба толькі дзеля верных „польскае веры" цэлае **imprymatur** у гэткай малой кніжаццы пададзено, як facsimile. O tempora! o mores!

Беларускіе касьцельные песьні ўжо маюць сваю гісторыю. Шырэйшае грамадзянство з імі пазнаёмілася першы раз у 1914 г., калі коштам „Беларускага Выдавецкага Таварыства ў Вільні" паказываецца ў М. Кухты „Кантычка або сабраньне набожных песень для ўжытку каталікоў — беларусаў", Другім этапам ёсць сэцяг песьняў, надрукаваных у беларускім малітэўніку „Бог з намі" (1915). „Касьцельные песьні" гэта ўжо трэці этап. У „Кантычцэ" некаторые песьні (ранічные, вячорные, калядные, вялікодные) гэта пітоманна пераклады даволі нявольнічые вядомых польскіх песьняў таеж трэсьці. Між іншым можна тут дадаць, што гэта аднак не кажэ процію ужываньня (гэткіх песьняў сярод песьняў польскіх таксама ёсць пераклады („Krzyż święty") „Dzień on" і inš.). Песьні, у малітэўніку „Бог з намі" маюць ўжо многа больш у сабе арыгінальнага пачатку, зачэрпненага з беларускага духа і з боку мовы прэдстаўляюць больш гладкіе і мэлядыйные. У кніжачцы „Касьцельные песьні" знаходзім новы ўдалы пераклад „Чэсць Твая, хвала", і орыгінальная песьня „Матачка Божая". Словы апошняй напісаў „А. С.", а ноты „В. Г.". Гэта салодкая і троху смутная мар'янская песьнячка, поўная народнага лірызму. Яе трэсьці атказывае мэлёдыя, злучаючая тры залеты касьцельнай песьні: пабожнасць, зычнасць і лёгкасць. — Наапошку ў нашай кніжачцы ёсць суплікацыя і гымны эўхарыстычные. Гэтак цэлая гамма учуцьцёў каталіцкага сэрца прынята тут пад увагу. Гэтааг беларускага песяньніка на пачатак зусім хапае, каб здаволіць патрэбы беларусаў -каталікоў у дадатковым касьцельным набажэнстве. Жадаем, каб ён як найболып быў пашырэны, як у ужыцьці хатнім, так і касьцельным на Беларусі з абодвых бакох кардону.

О. К

З усяго Краю.

Аб Літве.

На заседаньні нямецкага Рэйхстагу 19 марца консэрватыўны прамоўца, граф Вэстарп, сказаў:

«Нямецкіе ўплывы на акраінные народы павінны быць у поўнай меры забаспечэны і ў Літве».

Мораторіум.

Тэрміны вексэлёў і чэкаў, па загаду Обэр Ост, прадоўжэны ў нашым краю с 31 марца 1918 г. да 30 чэрвеня 1918 г.

ПАДБРОДЗЕ. У тутэйшым павеці ёсць 50 грамадзкіх народных школ.

НОВЫЕ ТРОКІ. Тутэйшая жыдоўская грамада наладзіла дабрачынны вечар, чысты зыск с каторага пойдзе на закупку опраткі для бедных дзяцей.

КОУНА. Усё насяленьне нашага места будзе прымусова ачышчацца ад вошы. Дзеля гэтага на беразі Нёмана будуюць вялізарную вашапрудку.

СУВАЛКІ. Па загаду глаўнага доктара, ў тутэйшую бальніцу пускаюць адведаць хворых толькі тых, хто мае сьведоцтва, што быў у вашапрудцы.

МЕРОСЛАУ, Оліцкага пав. Тутэйшы паліцэйскі, Езас Мінкевіч, узяўшы с сабой 2 работнікаў, паехаў з імі ў начы ў в. Равы, дзе зрабіў «обыск» і «сконфіскаваў» забітую сьвіньню. Суд за правышэньне ўласьці засудзіў Мінкевіча на 6 мес. у вастрог.

ОБРОМЕШКІНЫ, Владыславоўскага пав. Гаспадар Енас Гваздайтіс запаліў у вечары ў печы дзеля сушкі льна, а сам пайшоў с хаты. У часі яго нябытнасьці узняўся пажар, ад каторага будоўля згарэла. У дадатку Гваздайтіса аддалі пад суд за неасьцярожнасць з агнём і аштрафавалі за гэта.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

МАСКВА. У суботу соцыал-рэволюцыонеры, падтрымліваўшые урад, апублікавалі заяву, што, ня гледзячы на пацьверджэньне міра, яны не паложаць аружжа, а організуюць адпор пры помачы незалежнай арміі. У Пецярбузі з дня на дзень ждуць контррэволюціі. Ходзяць чуткі, што буржуазным партыям удалося перэцягнуць на свой бок адзін полк з аружжэм і амуніціей. Спадзяючыся контррэволюціі, ўмацоўваюцца ўсе грамадзкіе гмахі.

На з'езьдзі было 1094 дэпутатаў, у тым ліку 737 большэвікоў і 238 соцыал-рэволюцыонераў. Сьвердлов прачытаў прыветные тэлеграмы, у тым ліку пісьмо Вільсона. Чычэрын прачытаў даклад аб варунках міра. Ленін, каторага сустрэцілі оваціямі, сказаў прамову, кажучы аб здаволеньні патрэб Расеі, каб яна магла сабрацца з духам дзеля аканчацельнай баталіі.

ЛОНДОН (Рэўтэр). 18.III. Міністэрство загранічных спраў апавесьціло заяву, ў каторай між іншым гаворыцца:

„Міністры прэзыдэнты і міністры загранічных спраў саюзьнікаў заяўляюць, што так-званы „нямецкі мір" — гэта праступак проці расейскага народу. Нацыональнае жыцьцё Расеі абернено гэтай умовай у цень. Мы ня можэм прызнаваць гэткіх умоў".

Украіна.

Амэрыка і Холмская справа.

„Dziennik Narodowy" дастаў з Гаагі 18 лютага гэткіе весткі.

«Ад галандца, вельмі добра азнаёмленага з амэрыканскімі адносінамі, даведываюся:

Адлучэньне Холмшчыны мае прынцыпіяльнае значэньне, як першае правядзеньне ў жыцьцё прынцыпу вышшасьці права самаазначэньня народаў над гістарычнымі правамі. Як першая шчэрбіна ў цяперашнім парадку Эўропы, абапёртым на правох гісторыі, знаходзіць спогад у Амэрыцэ.

Украінцы маюць вялікшы спогад у Амэрыцэ, чымся палякі, як народ дэмакратычны, уціскаваны польскай шляхтай. Дый у гэту вайну выступалі украінцы ў Амэрыцэ згодна, а палякі вадзіліся між сабой. Калі б адлучэньне Холмшчыны было прычынай польска-украінскай барацьбы, дык бязсумлеўку амэрыканскіе сымпатыі былі б да украінцаў».

Як бачым палякам не ўдаецца ашукаць сьвету.

ПЕЦЯРБУРГ. Одэсса і Мікалаеў заняты бяз бітвы. Расейскі флот, быўшый у Одэссі, ўцёк у Севастополь. У Мікалаеве немцы заўладалі ваенными верфямі. Дарога ў Харкаў і Курск адкрыта. Большэвікі паспешна пакідаюць Харкоў.

З Румыніі.

БУКАРЭШТ (В.Т.Б.). Маргіломан назначэн за міністра-прэзыдэн-

та. Гэта — вядомы староннік міра і цэнтральных дзержаў.

БЭРЛІН. Румынскі габінэт Маргілёмана стаіць ня толькі за сэрдэчные зносіны с цэнтральнымі дзержавамі, але і за саюз з імі.

БУКАРЭШТ. Маргілёман маніцца зрабіць спробу захаваць трон цяперашняму каралю.

Пётр Карп і яго аднадумцы лічаць гэта немагчымым затым, што блізкіе зносіны с цэнтральнымі дзержавамі, канечне патрэбные цяпер дзеля жыцьця Румыніі, пры цяперашнім каралю, утраціўшым уселякую пашану і веру у цэнтральных дзержаў, немагчымы.

БУКАРЭШТ. Заміраньне між цэнтральнымі дзержавамі і Румыніей закончылося 19 марца, але аўтоматычна трывае далей.

У Японіі.

ЛОНДОН. Тутэйшые газэты наказываюць аб міністэрскім крызісе ў Японіі. Ворагі міністэрства — большая часць газэт і ўсе торговые кругі — проці выступленьня Японіі ў Сібіры.

ПАРЫЖ. Газэта міністра-прэзыдэнта Клемансо наказывае з Н'ю-Іорку, што умова між Амэрыкай і Японіей аб выступленьні апошняй на далёкім усходзі надпісана. Падробнасьці пакуль што ня могуць быць апавешчэны.

Наадварот, іншые газэты пішуць, бытцым Вільсон заявіць конгрэссу аб немагчымасьці для Амэрыкі дапусьціць выступленьне Японіі на далёкім усходзі.

Паводлуг газэтных вестак, у часі бітв у Благавешчэнску забіты каля 150 японскіх жыхароў, не здалеўшых уцячы.

ТОКІО. На коронной радзе з учасьцем імпэратара было заяўлено, што ваенное выступленьне на далёкім Усходзі адложэно да закрыцьця парлямэнту ў канцы гэтага месяца.

З усяго сьвету.

РОТТЭРДАМ. Голандзкае правіцельство прыстало на жаданьне Англіі і Амэрыкі, каб ім была выдана часць голандзкага торговага флоту на ўвесь час вайны. Англія і Амэрыка абязаліся вярнуць страты голандзкага торговага флоту ад падводнай вайны пасьля міра натураю, або — на жаданьне — грашыма. 460.000 тонн нідэрляндзкіх караблёў пераходзяць адгэтуль у рукі Амэрыкі і Англіі.

ЛОНДОН. «Daily Mail» піша с прычыны выдачы голандзкага торговага флоту, што падобные крокі будуць учынены і проці другіх нэутральных гасударств, бо ў сучаснай вайне не павінно быць нэутральнасьці.

ЖЭНЕВА. На парыжскім прадмесьці здарылася страшэнная катастрофа ад узрыву фабрыкі амуніціі. Паводлуг газэт, пацярпело 1.500 душ, а народ кажэ аб 20.000.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

19.III. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага: Прускіе, баварскіе і саксонскіе дывізіі ўзялі ў палон 300 бэльгійцаў. Ад узбярэжжа да каналу Лябассэ крапчэла артылерыйская бітва.

Фронт нямецкага Насьледніка і ф. Гальвіца: Пры Жівэнкур пасьля упорнай бітвы ў варожых акопах узяты 200 палонных. Наабапал Рэймса і ў Шампані момэнтамі востры агон. На паўночным фронці Вэрдэну агонь узмацаваўся. На усходнім беразі Маасу ўзяты 56 палонных.

Фронт Альбрэхта Вюртэмбэрскага: У Лётарынгіі, Вогезах і палудзенна-заходнім Эльзасе крапчэйшая баевая чыннасць французаў.

У бітвах на паветры збіты 23 варожые самалёты і 2 прывязные лятучые шары.

20.III. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага і нямецкага Насьледніка: Між морам і каналам Лябассэ крапчэла баевая чыннасць. У вечары агонь артылерыі дайшоў вялікшай сілы.

Фронт ф. Гальвіца і Альбрэхта Вюртэмбэрскага: Пры Вэрдэн трывала далей вострая артылерыйская бітва. Пры Бюр узяты палонные і кулемёты. У лесі Паруа, пры Бляімон і Бадон-Вільье — крапчэйшая баевая чыннасць са стараны французаў.

Усход.

Ля чыгункі на поўначы ад Ольвіополя, на Украіне, мы пасьля бітвы разагналі вялікіе банды.

Заміраньне з Румыніей прадоўжэно да 22 марца.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ЛОНДОН (В.Т.Б.—Рэўтэр). 19.III. Англіцкі ўрад да аўторка пааабедзі не дастаў адказу на ноту саюзьнікаў Голандзіі. З гэтай прычыны ў Гаагу послана новая нота, ў каторай высказываецца патрэба належыць ураз-жэ арэшт на голандзкіе караблі.

ГААГА. **Ніжняя Палата.** Голандзкі міністэр Лёўдон заявіў, што голандзкіе дэлегаты згодзіліся выдаць саюзьнікам часць голандзкага флоту — с тэй умовай, што ўзятые караблі ня будуць плаваць у поясе блокады. Міністэр нават сказаў, што у саюзьнікаў, здаецца, ёсць думка рэквізаваць 1 мільён тонн голандзкіх караблёў. Пасьля рэквізыціі трэба спадзевацца, што Нямеччына ня будзе дапускаць свабоднага выхаду голандзкіх караблёў з голандзкіх портаў.

Прамоўцы ўсіх партый высказалі гарачае абураньне с прычыны цяжкай абіды голандзкаму нацыональнаму пачуцьцю.

Гэткая доля малых народаў!

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Начальнік адміральнага штабу, адмірал Кох, заявіў аднаму карэспандэнту: «Гвалт над Голандзіей — гэта найлепшы доказ цяжкага палажэньня саюзьнікаў, недастачы ў іх торговых караблёў і удачнасьці нашай падводнай вайны».

ЦЮРЫХ. У амэрыканскіх военных кругах выяўляецца нэрвовае настраеньне с прычыны спадзеванага нямецкага наступленьня. Разгледаецца пытаньне, чы нямецкае наступленьне будзе зроблено проці францускага ці англіцкага фронту. Паводлуг думкі амэрыканскіх военных крытыкоў, амэрыканскіе войскі будуць гатовы да вайны не раней сёлетняй восені, або нават вясны будучага году.

ЛОНДОН. Нэрвовасць публікі с прычыны спадзеванага нямецкага наступленьня узрастае тут с кожным тыднем. Рэўтэр наказывае, што прыгатаўленьня французаў і англічан закончэны, і пазыціі іх можна лічыць недаступнымі.

ВЕНА. Між Венай і Кіевам, Будапэштам і Одэссай устаноўлены пачтовые зносіны паветранай дарогай.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Новые ўдачы падводных лодак у паўночных водах; 18.000 тонн.

БЭРЛІН (В.Т.В.). У поясе блокады навакол Англіі падводнымі лодкамі затоплено ізноў 19.000 т.

Пачтовая скрынка.

Зьмітраку Бядулі у Менску.

Вашы творы Рэдакція атрымала церав рукі п. В. Л. Дзякуем, скарыстаем.

АБВЕСТКІ.

НОВАЯ КНІЖКА

КАЛІСЬ...

сцэнічны абразок у 2 актах *Ф. Олехновіча.*

Цэна 50 фэн.

Прадаецца ў Беларус. Кнігарні.

КНІЖКІ ДЛЯ ШКОЛ:

Беларускі лемэнтар . . .
Bełaruski lementar . . . . . . 6 к.
Першае чытаньне . . . . 6 „
Pieršaje čytańnie . . . . . . 6 „
Haściniec dla małych dzietak 5 „
Другое чытаньне . . . . . . 25 „
Karotki katechizm . . . . . . 10 „
Karotkaja historyja światajа . 20 „
Karotkaje wyjaśnieńnie abradoŭ R.-Katalickaho kaścioła . . 15 „
Kantyčka . . . . 15 „
„Boh z nami“, knižka da nabaženstwa . . . . 40 „
Задачнік для пачатковых школ год I . . . . 15 „
Zadačnik dla pačatkowych škoł hod I . . . . 15 „
Zadačnik dla pačatkowych szkoł hod II i III . . . . 40 „
Гутаркі аб небе і зямлі . . 15 „
Кароткая гісторыя Беларусі 60 „
Karotkaja historyja Biełarusi . 60 „
Першая чытанка . . . . . . 25 „
Rodnyje zierniaty. Knižka dla školnaho čytańnia hod II i III. U aprawie 1 r., biez apr. . 85 „
Як правільна пісаць па беларуску (лацінск. літ.) . 10 „

Вільня, Завальная 7. Беларуская Кнігарня.

КНІЖНІЦА

Віленская вул., 33

дае да чытаньня кніжкі ў беларускай, нямецкай, расейскай і францускай мовах.




Выйшла з друку і прадаецца новая кніжка

НАШЫ ПЕСЬНЯРЫ

Социяльна-літэратурные нарысы **АНТОНА НОВІНЫ.**

ЦЭНА 1 марка.

Дастаць можна ў Беларускай Кнігарні, Завальная вул. 7.



Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.